Прачытаўшы сам—аддай другому.

Пралетарыі усіх краеў, злучайцеся!

# Савецкая БЕЛАРУСЬ

Год выданьня першы.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Менск, Літэрацка-выдавецкі аддзел Політычнага ўпраўленьня Заходняга хронту.

Выданьне РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТУ САВЕЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСІ.

№ 1 (11). | Нядзеля, 15-га жніўня 1920 г. | Кошт 2 руб.

## „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“.

„Савецкая Беларусь“ нарадзілася і вышла ў сьвет першага лютага гэтага году.

То была цяжкая пара для Беларусі і яе працоўнага народу. Панскі прыгон ціснуў яе бязьлітасна і безпагадна. Узмацованнае магнацтва і думкі не дапускала аб тым, што хутка прыдзе час пакінуць захоплены край і абараняць сваё жыцьцё пад сьценамі Варшавы.

Наадварот, уверанпае ў сваю сілу панства пускала ў ход усе способы, усе хітрыкі, сілу, грошы і абман, каб прыцягнуць да сябе Вольную Беларусь, ступіць на яе цяжкім абсацам і пад звон ланцугоў вярнуць даўнейшы прыгон ля работнікаў і сялян беларускіх.

Наўтрымны зьдзек гуляў па краіне, а працоўны беларус, як і заўсёды, згінаючы сьпіну, пакорна маўчаў і чагосьці чакаў, затаіўшы вялікую помсту да сваіх угнятацеляў.

У гэты час, на ўсходняй аскраіне Беларусі, вольнай і свабоднай, у г. Смаленску, гурток беларусаў-бальшавікоў, між іншай працай не забываў аб забранай панамі частцы сваё краіны. Яе мукі і стогны адбіваліся ў іх грудзёх нястрымнай помстай, а вера ў блізкі час яе звальненьня—застаўляла выгукваць кліч узбуджэньня, кліч паўстаньня проці паноў к працоўнаму народу Беларусі, дзе-б ён ня быў.

І гэты кліч, выкладаны на паперу, складаны ў друкаваные радкі газэты, разносіўся ўсюды і казаў у кожным слове і кожным радку, што Беларусь — „Савецкая Беларусь“, што гаспадар краю—работнік і селянін, а ня крывавы, польскі пан.

Што гэта ёсьцека і будзе! Жыцьцё пасьпяшыла гэта апраўдаць.

Уздым Рэвалюцыі, ахапіўшы чырвоную армію, памог ёй найхутчэй-жа скінуць панскі прыгон і зрабіць Беларусь вольнаю, Савецкаю стараною.

У Чырвоную сталіцу Беларусі-Менск, „Савецкая Беларусь“ увайшла хоць на расейскай мове, але з тым-жа духам, с тым настроем, с тэю вераю ў скорае запанаваньне комунізму па ўсім сьвеце, у захаваньне вольнай Беларусі на векі, з якімі яна і нарадзілася. Праз 20 нумараў яна трымала высока сьцяг соцыялістычнай Беларусі, цьвёрда і ўверана, і перадала яго нам ізноў.

*Цяпер „Савецкая Беларусь“ выходзіць у Соцыялістычнай Савецкай Рэспубліцы Беларусі на беларускай мове.—на мове работнікаў і сялян Беларусі.*

Яе заданьне, як і ўперад, *было будзіць* беларускі працоўны народ да *прылучэньня яго к вялікай сям'і працоўнага народу ўсяго сьвету, да прычашчэньня воляю комунізму. да творчасьці новага свабоднага жыцьця.*

*„Савецкая Беларусь“—газэта беларускіх сялян і рабочых, праца ў ёй—іх абавязак.*

## Абарона Савецкіх Рэспублік.

*Вестки Палявога Штабу Рэвалюцыйнага Савету Рэспублікі (за 13 жніўня).*

### Заходні хронт.

У **Седлецкай вакрузе** нами забрана мястэчка **Бежун**. Часткі нашага войска падыходзяць да рэчкі **Ўкра**, дасягнуўшы пунктаў на 20 і 25 вёрстаў ўсходней гэтае рэчкі.

Забраўшы **Вышкаў**, мы падаліся заходней, паўдзённей і ўсходней ад гэтага гораду.

**11 жніўня нами забраны гор. Венграў і гор. Лукаў.**

### Паудзенна-Заходні хронт.

**У Ўладзімір-Валынскай ваколіцы** наша войска далей наступае.

### Паудзенны хронт.

**На рэчцы Днястру і ўзбярэжжу Чорнага мора** без перамен.

**На Крымскім вучастку. у Арэхаўскай** ваколіцы наша коньніца вядзе ўпартую бойку з вялікімі сіламі ворага.

*За ваеннага камісара палявога штабу Рэвалюцыйнага ваеннага савету Рэспублікі* **Васільеў.**

## Як ратаваўся Кобрын.

Горад Кобрын вельмі цікава бараніўся ад адступаючых бандаў белай шляхты. Гэта, бадай, адзіны горад на Беларусі, дзе ўцалелі грамадзянскіе будынкі, вакзал і навет масты праз раку Мухавец.

Здарылася гэта дзякуючы „сумнаму“ непаразуменьню За два дні перад выхадам з Кобрына група пазнанцаў уварвалася ў дом старасты п. Бабынскага і, прыняўшы яго за жыда, пачала рабаваць яго дом і паранілі яго.

Выпадкова пазнанцы былі схопленые і па загаду камэнданта разстрэляны зараз-жа. Гэта навяло перапалох на банды рабаўнікоў, і яны хутка пакінулі горад.

Жыхары спаткалі Чырвоную армію вельмі прыхільна і перадалі ей вялікіе запасы харчоў, якіе шляхта не пасьпела вывезьці.

## Чырвоная Польшча.

Побач з тым, як Чырвоная армія прабіраецца наперад углыб Польшчы, ва ўсіх мясцох і гмінах прыкмячаецца вялікі пад'ём сярод польскага рабочага люду. Галоўным чынам прыхільна спаткаюць Чырвоную армію батракі, якіе вякамі мучыліся пад ярмом польскіх памешчыкаў.

У некаторых паветах батракі арганізаваліся да прыходу Чырвоных войск і ўзброіліся аружжам легіянэраў, якіе ўцякаюць з хронту.

Дэзэртырство ў польскай арміі настолькі павялічылася, што прышлося стварыць дзеля гэтага спэцыяльные карацельные атрады з жандараў. Многіе легіянэры і пазнанцы бягуць з хронту, каб вывезьці нарабаванае дабро. Батракі не дазваляюць паном вывазіць з маёнткаў жывёлу і інвэнтар, а ў некаторых мясцох арганізуюцца і партызанскіе атрады.

У вызваленых мясцох Рэвалюцыйные камітэты складаюцца толькі з палякоў.

